Трэці этап рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах
«Беларуская мова» і «Беларуская літаратура» 2020/2021 навучальны год

ТРЭЦІ ЭТАП XXXVII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ
«БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Студзень 2021 г.*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**11 клас**
**Варыянт 1**

**Заданне 1.**

| Спалучэнне | Магчымае выкарыстанне словазлучэння |
|---|---|
| *каля (двое) сутак* | *двух сутак* |
| *(2) лыж* | *дзве пары лыж* |
| *(22) санак* | *дваццаць дзве штукі* санак |
| *(8) акуляраў* | *восем акуляраў* |
| *(5) нажніц* | *пяцёра нажніц, пяць нажніц* |
| *(5) штаны* | *пяцёра штаноў, пяць штаноў* |

*За кожны правільна складзены сказ – 1 бал.*

**Заданне 2.**

А) прасіць напрамілы бог
Б) надзьмуцца як жаба на карчы
В) гады у рады
Г) душа наросхрыст
Д) пішчыць як свіння ў плоце
Е) ісці як не сваімі нагамі

*За кожную правільна падабраную пару – 0,5 бала, за кожнае правільнае напісанне слоў, дзе трэба было раскрыць дужкі ці ўставіць літару, – 0,5 бала.*

**Заданне 3.**

| № | Прыкладнае тлумачэнне |
|---|---|
| 1. | Чацвёртае лішняе: *гаршчок – гаршчкі*. Правільна: *гаршчок – гаршкі* (пры ўтварэнні множнага ліку літара *ч* выпадае), астатнія пары ўтвораны правільна. |
| 2. | Чацвёртае лішняе – слова *плацкарты*, паколькі гэта назоўнік жаночага роду (*плацкарта*), а ўсе астатнія назоўнікі ніякага роду. |
| 3. | Чацвёртае лішняе: *міні-рыначная (пляцоўка)* трэба пісаць праз злучок, паколькі гэты прыметнік утвораны ад назоўніка *міні-рынак*, які пішацца праз злучок. Усе астатнія прыметнікі напісаны правільна. |
| 4. | Чацвёртае лішняе: *абое сутак*. Лічэбнік *абое* ўжываецца, калі гаворка ідзе пра асоб рознага полу (*абое, сын і дачка*). З множналікавым назоўнікам суткі трэба спалучыць лічэбнік *двое* (*двое сутак*). Усе астатнія словазлучэнні лічэбнікаў з назоўнікамі пабудаваны правільна. |

| | |
|---|---|
| 5. | Чацвёртае лішняе: *мы ўсё сцярпім* (напісанне граматычнай формы дзеяслова адпавядае норме). У астатніх граматычных формах дзеясловаў дапушчаны памылкі. Трэба *сцелецца* (I спражэнне – *слацца*), *коле* (I спражэнне – *калоць*), *беражом* (у загадным ладзе – *беражэм*). |
| 6. | Чацвёртае лішняе: *адолеўшы – адолець*. Гэта формы аднаго і таго ж дзеяслова. Ва ўсіх астатніх выпадках прыведзены формы розных дзеясловаў: *занядужаўшы – занядужаць, збягаючыся – збягацца, разросшыся – разрасціся*. |

*За кожнае правільна вызначанае чацвёртае – 0,5 бала, за кожнае правільнае тлумачэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 4.**

| **Апісанне** | **Патрэбная граматычная форма** | **Транскрыпцыя** |
|---|---|---|
| семдзесят **– парадкавы лічэбнік у форме м. р.** | сямідзясяты | [с’ам’ідз’ас’áты] |
| 6 коней – шасцярык, 8 коней – **?** | васьмярык | [вас’м’ары́к] |
| дзевяць – **зборны лічэбнік** | дзявяцера | [дз’ав’áц’эра] |

*За кожны правільны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 5.** А3Б2В5Г5Д7Е2

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| **№** | **Выпраўлены варыянт** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| 1. | Міністэрства па надзвычайных сітуацыях праводзіць апытанне грамадскага меркавання па пытанні ўвядзення абмежаванняў на прымяненне піратэхнічных вырабаў. | *Апытанне па пытанні* – таўталогія. |
| 2. | Валанцёры наведаюць радзільню, дзе ўручаць сувеніры і падарункі з нацыянальным арнаментам 8 мамам новванароджаных. | Нельга ўручыць падарункі нованароджаным. |
| 3. | Шмат гадоў прайшло пасля першага выдання рамана І. Шамякіна «Сэрца на далоні». | *Выдавецтва* – гэта ўстанова, якая займаецца выданнем кніг, часопісаў; памылка звязана з неразмежаваннем паронімаў *выдавецтва.* |
| 4. | | памылкі няма. |
| 5. | Мы стараемся адаптавацца да зменлівых умоў і спадзяёмся, што пастаўленыя на наступны год задачы будуць вырашаны ***<u>або</u>*** Мы стараемся адаптавацца да зменлівых умоў і спадзяёмся, што пастаўленыя на наступны мэты год будуць дасягнуты. | Памылка звязана з лексічнай неспалучальнасцю, што стварае недакладнасць выказанай думкі: *мэты* можна *дасягнуць*, а *задачы* – *вырашыць*. |

| | | |
|---|---|---|
| 6. | Патрабаванні заказчыка неабходна выканаць у найбліжэйшы час. | *Патрабаванні патрабуецца (выканаць)* – таўталогія |

*За кожны правільна запоўнены радок – 1 бал (па 0,5 бала за выпраўлены варыянт і за тлумачэнне). У пазіцыі 5 удзельнік алімпіяды, які напісаў у слупку "Тлумачэнне" "памылкі няма", атрымлівае 1 бал.*

**Заданне 7.**

Сталічныя гарады, як і дзяржавы, як і народы, перажываюць перыяды ўздыму і ўпадку. У перыяд феадальнай раздробленасці сталіцамі беларускіх земляў (зямель) станавіліся (былі, з'яўляліся) Полацк, Тураў, Гродна (Гародня). Затым (потым, пасля таго) аб'яднаўчую ролю ігралі (адыгрывалі) Навагрудак (Наваградак), Вільня. Але ўжо з канца XVI стагоддзя, з утварэннем Нясвіжскага княства, з абнаўленнем горада, распачатым (што распачаў, пачаў, прадпрыняў) рэфарматарам і асветнікам Мікалаем Крыштóфам Радзівілам Сіроткам (1549–1616), Нясвіж пачаў сапернічаць (спаборнічаць) з Вільняй, процістаяць ёй, а потым нават і Варшаве.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Вершаваныя радкі | Вершаваны памер | Тып рыфмоўкі | Сродак паэтычнага сінтаксісу |
|---|---|---|---|
| *А* | 4-стопны ямб | перакрыжаваная | анафара / паўтор |
| *Б* | 4-стопны амфібрахій | кальцавая (апаяс(а)ная) | эпіфара / паўтор |
| *В* | 4-стопны ямб | перакрыжаваная | антытэза |
| *Г* | 4-стопны ямб | перакрыжаваная | рытарычнае пытанне |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 9.**

| Апісанне | Герой | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| *А* | Зося Савіч | "Сэрца на далоні" | Іван Шамякін |
| *Б* | Міхал | "Новая зямля" | Якуб Колас |
| *В* | Ганна Чарнушка | ""Людзі на балоце" ("Палеская хроніка") | Іван Мележ |
| *Г* | Барыс Фішар | "Жураўліны крык" | Васіль Быкаў |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

Пры ацэнцы трэба ўлічваць правільнасць прыведзеных фактаў і аргументаў, адпаведнасць умовам капелюша.

Схема адказу:

Белы – Алесь Загорскі – герой рамана "Каласы пад сярпом тваім" У. Караткевіча.

Жоўты – Алесь папрасіў дзеда, каб той унёс плату за навучанне Кастуся Каліноўскага ва ўніверсітэце.

Чорны – Алесь засмуціў маці, бо забыў французскую мову.

Чырвоны – калі чытаеш пра Алеся, не пакідае адчуванне захаплення яго высакароднасцю.

Зялёны – Алеся Загорскага можна параўнаць з Лабановічам (“На ростанях” Якуба Коласа), Славікам Шыковічам (“Сэрца на далоні” Івана Шамякіна), бо гэта прадстаўнікі прагрэсіўнага маладога пакалення.

Сіні – героі твораў Уладзіміра Караткевіча даюць узоры нацыянальных характараў.

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*